5. Строк, Л.И. Русский язык: 5 класс: орфографические тренажеры, занимательные материалы: пособие для учащихся учреждений, обеспечивающих получение общ. сред. образования, с белорус. и рус. яз. обучения / Л.И.Строк. – Минск: Аверсэв, 2007. – 60 с.

*Дата поступления в редакцию: 11.04.2023*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ВОБЛАКА СЛОЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ЯК СРОДКА АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ

*Баўстуноўская Валянціна Мікалаеўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле раскрываюцца ўмовы павышэння пазнавальнай актыўнасці вучняў пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры на прыкладзе выкарыстання прыёма “воблака слоў”. Прапануюцца заданні, распрацаваныя на аснове воблака слоў, выкарыстанне якіх дазволіць павысіць матывацыю вучняў пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры.*

Практыка паказвае, што вучням, асабліва пяцікласнікам, вельмі складана трымаць увагу на працягу ўсяго ўрока. Таму ў сваёй дзейнасці імкнуся прымяняць розныя формы і прыёмы навучання, тое, што можа павысіць вучэбную матывацыю і пазнавальную актыўнасць. адным з такіх прыёмаў з’яўляецца “воблака слоў”. Сэрвісаў для яго стварэння даволі многа, адзін з іх – праграма Wordart.com. Згенераванае воблака слоў можна выкарыстоўваць у электронным, раздрукаваным выглядзе, вывесці яго на экран смартфонаў або інтэрактыўную дошку (пры магчымасці).

Напрыклад, падчас вывучэння ў V класе тэмы “Тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне” на этапе тлумачэння і замацавання ведаў можна прапанаваць вучням працу з воблакам слоў, якое ўтрымлівае ў сабе не толькі тэарэтычныя паняцці, але і варыянты загалоўкаў тэкстаў. Такая падача матэрыялу будзе садзейнічаць засваенню вучнямі адрозненняў тыпаў тэксту, аналітычнаму асэнсаванню іх загалоўкаў. Дарэчным будзе выкарыстанне такога прыёму пры вывучэнні правапісу мяккага знака. Прапануецца практыкаванне, у якім трэба выпісаць словы, дзе мяккі знак пішацца ў сярэдзіне слова, ці словы з мяккімі суседнімі зычнымі (малюнак 1).




Малюнак 1.

Таксама выкарыстоўваю воблака слоў пры паўтарэнні раздзела “Сінтаксіс і пунктуацыя” і прапаную выпісаць назвы дадзеных членаў сказа, пытанні, на якія яны адказваюць, і часціны мовы, якімі яны выражаны (малюнак 2).




Малюнак 2.

Пры вывучэнні тэмы “Правапіс [д] – [дз`], [т] – [ц`]” прапаноўваю вучням выбраць з дужак правільнае спалучэнне літар (малюнак 3).




Малюнак 3.

Пры вывучэнні ў 6 класе тэмы “Назоўнік” задача вучняў, карыстаючыся воблакам слоў, узнавіць прапушчаную інфармацыю. Такі прыём карысны для развіцця ўмення аргументаванага выказвання пры зама-

цаванні граматычных ведаў (малюнкі 4, 5).




Малюнак 4.




Малюнак 5.

Пры вывучэнні тэмы “Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх роля ў маўленні” можна прапанаваць вучням самастойна скласці воблака слоў (прыметнік, якасныя, адносныя, прыналежныя, які, чый, матчын, асенні, светлы). Пры гэтым вусна яны павінны растлумачыць кожнае паняцце і падабраць свае прыклады. На этапе замацавання матэрыялу прапаную шасцікласнікам з воблакаў слоў выпісаць адпаведныя кожнаму разраду прыклады.

На ўроку па тэме “Прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, сфера іх ужывання, правапіс” з прапанаванага воблака слоў вучні выпісваюць прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, абазначаюць суфіксы графічна (малюнкі 6, 7).




Малюнак 6.




Малюнак 7.

Актуальным з’яўляецца выкарыстанне воблака слоў і на ўроках беларускай літаратуры. Воблакі слоў дапамагаюць узнавіць у памяці творы літаратуры, асноўныя літаратуразнаўчыя паняцці, характарызаваць вобразы і інш. Напрыклад, можна прапанаваць вучням здагадацца па тэгах, які літаратурны твор зашыфраваны. Або ў межах тэмы “Якуб Колас. “Крыніца” з мэтай удасканалення аналітычных уменняў пяцікласнікаў у якасці дамашняга задання можна прапаванаваць складанне воблака слоў “Характарыстыка персанажаў”. Такім чынам, вучні могуць самі ствараць воблакі слоў па зададзеных крытэрыях.

Па тэме “Прыказкі і прымаўкі” (V клас) з выкарыстаннем воблака слоў (малюнак 8) прапаную скласці прыказкі на тэму Радзімы, адносін людзей да Радзімы, знайсці устойлівыя выразы, у якіх праяўляюцца чалавечыя якасці, пачуццё любові і гонару за родную зямлю, патрыятызм беларускага народа. Праца па падбору прыказак арганізуецца ў парах. Падчас праверкі вучні тлумачаць сэнс кожнай прыказкі. Такім чынам пашыраецца і ўзбагачаецца слоўнікавы запас вучняў, фарміруюцца ўменні звязнага выкладу думак, засвойваюцца літаратурная нормы маўлення, развіваецца культура суразмоўніцтва. Такая форма работы  спрыяе выхаванню сістэмы нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей.




Малюнак 8.

Абагульненне матэрыялу можна арганізаваць з выкарыстаннем такой формы, як работа ў парах. Вучні вылучаюць у воблаку слоў імя аўтара, адшукваюць і суадносяць яго з напісанымі ім творамі. Потым кожнай пары даецца заданне ўспомніць змест пэўнага твора, раскрыць яго тэму, ідэю, паразважаць, што хацеў сказаць аўтар, дзеля чаго ён напісаў гэты твор. У канцы ўрока вучні прыходзяць да вываду, што творы радзела прысвечаны тэме Радзімы, яе ролі ў жыцці кожнага чалавека, вучаць любіць і вывучаць яе мову і літаратуру.

Прыём "воблака слоў" таксама з'яўляецца эфектыўнай формай арганізацыі пазакласнай працы. Напрыклад, падчас правядзення тыдня белрускай мовы вучням было дадзена заданне скласці воблакі слоў на тэму "Загадкі", "Маё любімае беларускае слова", "Прызнаюся ў любові беларускаму слову". У выніку атрымаліся цікавыя прыклады (малюнкі 9, 10).




Малюнак 9.




Малюнак 10.

Работа на ўроках з воблакам слоў захапляе вучняў, выклікае цікавасць, канцэнтруе ўвагу, пабуджае да пошуку, развівае ўменне назіраць, суадносіць, вылучаць галоўнае. У працэсе такой працы вырашаюцца навучальныя, развіваючыя, карэкцыйныя задачы [2].

Такім чынам, воблака слоў – гэта ўніверсальны інструмент, які можна выкарыстоўваць на розных этапах пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры. Галоўная ўмова паспяховага навучання сёння – здольнасць настаўніка ўдасканальваць сучасны ўрок, знаходзіць новыя падыходы, сродкі навучання, якія дазваляюцьпавышаць цікавасць да вывучаемага прадмета, а разам з тым і якасць ведаў вучняў.

### Спіс літаратуры

1. Казачэнка, І.Р. Эфектыўныя формы работы з візуальнай інфармацыяй на ўроках беларускай мовы і літаратуры / І.Р. Казачэнка // Сборник материалов Web–конференции «Визуализация, эксперимент, взаимодействие: использование цифрового контента и ресурсов в педагогической деятельности» [Электронный ресурс]. – Гомель, 2020. – С. 45 – 48. – Рэжым доступу: goiro.by/images/doc/konferencii/28.02.2020.pdf. – Дата доступу: 24.04.2023.

2. Рощина, И.В. Средства визуализации современного урока языка и литературы / И.В. Рощина. – Рэжым доступу: elib.bsu.by/bitstream.pdf. - Дата доступу: 21.04.2023.

3. Шумак, Е.Г. Двадцать способов использования «облака слов» на уроках русского языка и литературы / Е.Г. Шумак // Русский язык и литература. – 2017. – №7. – С. 21 – 27.

*Дата поступления в редакцию: 26.04.2023*